УДК 94(4)+327.8(4)

# “ХРОНІКА ПОЛЬСКАЯ, ЛІТОЎСКАЯ, ЖАМОЙЦКАЯ І ЎСЁЙ РУСІ” МАЦЕЯ СТРЫЙКОЎСКАГА ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XIV – СЯРЭДЗІНЕ XV СТ.

***Людміла Мікалаева***
*Мінск, Беларусь*

У артыкуле аналізуецца змест “Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі” Мацея Стрыйкоўскага. Робіцца выснова аб магчымасці выкарыстання яго ў якасці цікавай крыніцы па гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – сярэдзіны XV ст.

***Ключавыя словы: крыніцы, знешняя палітыка, Вялікае Княства Літоўскае, Мацей Стрыйкоўскі.***

Сярод крыніц, напісаных у другой палове XVI ст., якія могуць быць выкарыстанымі для даследавання гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) у канцы XIV – сярэдзіне XV ст., бясспрэчную цікавасць выклікае “Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсёй Русі” (далей – “Хроніка…”) Мацея Стрыйкоўскага, складзеная на польскай мове, якая ахоплівала падзеі гісторыі ВКЛ ад легендарнага перыяду да 1581 г. Для напісання дадзенага артыкула намі было выкарыстана яе трэцяе выданне, ажыццёўленае ў 1846 г. Асноўныя звесткі, меўшыя дачыненне да знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ разглядаемага намі перыяду, былі змешчаны ў другім томе “Хронікі…” [1]

(першае выданне “Хронікі…” пабачыла свет яшчэ у 1582 г. у Караляўцы (Кёнігсбергу) [2], другое выданне выйшла ў 1766 г. [3]).

Беларускія даследчыкі дзейнасці Мацея Стрыйкоўскага згодныя ў тым, што ён быў першым гістарыёграфам ВКЛ [4, с. 69; 5, с. 59]. Пагаджаецца з гэтым і найбольш вядомы на сёння польскі знаўца яго творчасці, прафесар Універсітэту імя Адама Міцкевіча ў Познані Збыслаў Вайткавяк, пра што сведчыць і назва яго манаграфіі [6]. Асоба аўтара “Хронікі…”, змест якой “адметны “літоўскім” патрыятызмам, прыхільнасцю да дынастыі Ягелонаў” [5, с. 62], звяртае на сябе ўвагу хаця б тым, што ён не быў ураджэнцам ВКЛ. Энцыклапедычныя звесткі пра яго паведамляюць, што Мацей Стрыйкоўскі – польскі гісторык, храніст, паэт [7, с. 638]. Нарадзіўся ён у 1547 г. у Стрыкаве, мястэчку Ленчыцкага ваяводства ў Польшчы ў беднай шляхецкай альбо мяшчанскай сям’і судовага возната. У 1561 г ён скончыў парафіяльную школу ў Бжэзінах, атрымаўшы там грунтоўную адукацыю [4, с. 70; 5, с. 60]. У 16-гадовым узросце Мацей прыехаў у ВКЛ, дзе лёс наканаваў яму стаць прафесійным вайскоўцам, а таксама, верагодна, рыскуном на мяжы з Рускай дзяржавай [6, с. 13 – 98]. У 1572 – 1574 гг. Мацей Стрыйкоўскі служыў у Віцебскім гарнізоне, працуючы адначасова над гісторыяй ВКЛ і суседніх дзяржаў, якая, па меркаванні шэрагу даследчыкаў, у значнай ступені была запазычана ў творы “Апісанне Еўрапейскай Сарматыі” камандзірам Віцебскага гарнізона Аляксандрам Гваньіні, якога абвінавачваюць у плагіяце [4, с. 71 – 73; 7, с. 638]. У 1574 – 1575 гг. вядома пра ўдзел Мацея Стрыйкоўскага ў пасольстве ў Турцыю. Пасля яго лёс зноў аказаўся звязаны з ВКЛ. Тут ён знайшоў падтрымку мецэнатаў з ліку мясцовых магнатаў. Так, яшчэ ў другой палове 1560-х – першай палове 1570-х гг. яго апякунамі сталі прадстаўнікі роду Хадкевічаў [4, с. 75 – 76]. У 1576 – 1578 гг. ён працаваў пры двары князя Юрыя Юр’евіча Алелькавіча. Пасля смерці апошняга новым мецэнатам Мацея Стыйкоўскага стаў жамойцкі біскуп Мельхіёр Гедройц, хутчэй за ўсё пры падтрымцы якога, насуперак закону, які забараняў іншаземцам займаць пасады ў ВКЛ, маладому паляку ўдалося стаць жамойцкім канонікам [4, с. 75 – 77; 5, с. 61]. Памёр Мацей Стрыйкоўскі ў ВКЛ каля 1590 г., верагодна, пачас эпідэміі 1588 – 1590 гг. [4, с. 79; 5, с. 60; 7, с. 638].

Час, на які прыходзілася актыўная дзейнасць Мацея Стрыйкоўскага, вызначаўся супадзеннем эпох Адраджэння і Рэфармацыі, а таксама пачаткам Контрэфармацыі на землях ВКЛ. У гэты перыяд на хвалі інтэнсіўнай палемікі паміж прыхільнікамі “традыцыйнага” і “заходняга” цывілізацыйнага выбару назіралася абуджэнне інтарэсу да гістарычных ведаў. У тагачаснай гістарыяграфіі гэта вылілася ў з’яўленне новага жанра хранографаў, у рамках якога гісторыя насельніцтва беларускіх зямель звязвалася з сусветнай гісторыяй [5, 59 – 60]. Да прац такога тыпу адносілася і “Хроніка…” Мацея Стрыйкоўскага.

“Хроніка…” складалася з пяці частак: вершаванага жыцяпісу аўтара, прадмовы са зваротам да шляхты, самой “Хронікі…”, якая складалася з 25 кніг, падзеленых на раздзелы, спіса памылак друку, рэестра ўласных імёнаў [5, с. 61]. У публікацыі 1846 г. апошняя частка ўжо не была пададзена выдаўцамі. Інфармацыя, характарызуючая перыяд канца XIV – сярэдзіны XV ст., была прадстаўлена ў 13 – 18 кнігах “Хронікі…” [1, с. 72 – 240].

Дадзены твор вылучаўся не толькі шырынёй разглядаемых падзей, якія ахапілі перыяд ад біблейскіх часоў да 1581 г., але і даследчыцкай пазіцыяй храніста, які не выступаў як просты сярэднявечны кампілятар. Мацей Стрыйкоўскі здолеў выкарыстаць шырокае кола гістарычных крыніц, у ліку якіх, па словах В. Чамярыцкага, былі як творы антычных гісторыкаў Герадота, Ціта Лівія, Клаўдзія Пталамея, Страбона, так і творы польскіх храністаў Яна Длугаша, Мацея Мяхоўскага, Бернарда Вапоўскага, Марціна Кромера, Марціна Бельскага, крыжацкага храніста Пятра з Дусбурга, таксама старажытнарускія і беларуска-літоўскія летапісы [8, с. 721]. Па меркаванні А.А. Семянчук, “…З улікам гістарыяграфічнай канцэпцыі і крыніцазнаўчага метаду Стрыйкоўскага можна карыстацца яго творамі як крыніцамі па гісторыі Вялікага княства Літоўскага, а таксама Русі Маскоўскай і старажытных дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Усходняй Еўропы” [4, с. 101].

Падзеі знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XV ст. дастаткова грунтоўна прааналізаваны на старонках “Хронікі…”. Пра падзеі Крэўскай уніі 1385 г. храніст расказаў ужо ў трэцім раздзеле кнігі 13 [1, с. 72 – 74]. Ініцыятыва заключэння ўніі прыпісвалася Стрыйкоўскім вялікаму князю літоўскаму Ягайле, які прыслаў сваіх паслоў у Польшчу з наступнымі прапановамі: прыняцце Ягайлам і ўсімі яго падданымі хрышчэння, вяртанне зямель, захопленых калісьці ў палякаў Літвой, дапамога ў вяртанні іншых страчаных Польшчай зямель, у т.л. Сілезіі, Памор’я, Прусіі, аб’яднанне ВКЛ з Польшчай назаўсёды, накіраванне усіх багаццяў Ягайлы на карысць Кароны [1, с. 72]. Пасля прыезду Ягайлы ў Кракаў у лютым 1386 г., хрышчэння і вянчання з каралевай Ядзвігай, ён ВКЛ да Кароны “prawem wiecznym przyłączył i w jedno ciało spoił, potwierdziwszy zapissów swoich przysięgą” [1, с. 74 – 75]. На старонках кнігі 13 прысутнічаў і падрабязны разгляд дзеянняў, звязаных з супрацьстаяннем паміж ВКЛ і Тэўтонскім і Лівонскім Ордэнамі, актыўна ўмешваўшыхся ва ўнутраныя спрэчкі паміж прадстаўнікамі правячай дынастыі на баку князёў Андрэя Альгердавіча і Вітаўта Кейстутавіча супраць Ягайлы і Скіргайлы Альгердавічаў, а таксама з ўдзелам у грамадзянскай вайне ў ВКЛ смаленскага князя Святаслава [1, с. 75 – 77, 83 – 94]. Таксама у кнізе 13 меліся звесткі пра дынастычныя шлюбы прадстаўніц дынастыі Гедымінавічаў з мазавецкімі (Аляксандры Альгердаўны з Земавітам Мазавецкім [1, с. 81 – 82], Рынгалі Кейстутаўны з Генрыкам Мазавецкім [1, с. 94]) і маскоўскім (Соф’і Вітаўтаўны з вялікім князем маскоўскім Васілём Дзмітрыевічам [1, с. 94]) князямі

Кніга 14 ужо ў першым раздзеле зноў распавядала пра ўдзел крыжакоў у паходах на ВКЛ на баку Свідрыгайлы Альгердавіча, які дабіваўся трона вялікага князя [1, с. 98 – 100, 108, 120 – 122]. Трэці раздзел кнігі 14 падрабязна тлумачыў абставіны спрэчкі за Падолле паміж ВКЛ і Польшчай, схіляючыся на ліцвінскі бок [1, с. 105 – 107]. Адзначый храніст і васальную залежнасць ад вялікага князя Вітаўта смаленскага князя Юрыя Святаславіча [1, с. 109], з якой апошні хутка выйшаў, што стала прычынай ваеннай актыўнасці ВКЛ на ўсходзе супраць кааліцыі Смаленскага і Разанскага княстваў, пазбаўлення Юрыя Святаславіча трона ў Смаленску і прызначэння туды яго брата Глеба, які таксама толькі часова прызнаў сябе васалам Вітаўта. У далейшым князь Глеб Святаславіч таксама быў пазбаўлены ўлады ў Смаленску, які быў далучаны да ВКЛ у якасці намесніцтва [1, с. 110]. Пад 1396 г. храніст паведаміў пра сустрэчу вялікага князя літоўскага Вітаўта з яго зяцем вялікім князем маскоўскім Васілём у Смаленску і заключэнне пагаднення, скіраванага супраць хана Цімура з мэтай вяртання трона Заволжскай Арды хану Тахтамышу [1, с. 111]. Ужо у пятым раздзеле змешчаны рыфмаваны аповяд Стрыйкоўскага пра перамогу Вітаўта над Нагайскай і Заволжскай Ордамі ў 1397 г. [1, с. 112 – 113], а таксама вершаваны аповяд пра нешчаслівую для ВКЛ бітву з татарамі на р. Ворскле ў 1399 г. [1, с. 113 – 116]. У шостым раздзеле Стрыйкоўскі паведаміў пра ўмовы чарговай уніі паміж ВКЛ і Польшчай, падпісанай у 1401 г. [1, с. 118]. У сёмым раздзеле паведамлялася пра канчатковае ўключэнне Смаленскага княства ў склад ВКЛ у 1404 г. пасля спроб князя Юрыя Святаславіча вярнуць сабе трон [1, с. 120]. У восьмым раздзеле храніст змясціў два рыфмаваныя паведамленні пра войны паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім ў 1406 і 1408 гг., і замацаванні граніцы паміж дзяржавамі па р. Угры [1, с. 122 – 124]. У дзявятым раздзеле падрабязна распаведзена пра прычыны і абставіны пачатку ваенных дзеянняў падчас вайны паміж Польшчай і ВКЛ з Тэўтонскім Ордэнам 1409 – 1410 гг., аб недобрасумленнай пазіцыі ў гэтым канфлікце чэшскага караля Вацлава, а таксама венгерскага і рымскага караля, а пазней імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Жыгімонта Люксембургскага [1, с. 125 – 127].

Кніга 15 пачыналася рыфмаваным аповядам пра перамогу польска-ліцвінскага войска ў Грунвальдскай бітве 1410 г. [1, с. 128 – 138]. Аб далейшым ходзе падзей пасля яе распавядалі другі і трэці раздзелы кнігі 15. У апошнім таксама паведамлялася пра ўмовы Торуньскага пагаднення 1411 г. [1, с. 139 – 145]. Абставіны і ўмовы Гарадзельскай уніі ВКЛ з Польшчай 1413 г. былі прадстаўлены ў пятым раздзеле [1, с. 147 – 150]. Аднаўленне актыўнасці ВКЛ на паўночна-ўсходнім напрамку і прывядзенне ў васальную залежнасць

Пскова і Вялікага Ноўгарада ў 1414 г. асветлены ў шостым раздзеле [1, с. 150 – 151]. У ім жа змешчана паведамленне пра чарговую спробу прывесці ў падпарадкаванне Тэўтонскі Ордэн, які пры новым вялікім магістры Махаэле Кухмайстары парушыў умовы пагаднення 1411 г. [1, с. 152]. На старонках кнігі 15 таксама можна знайсці цікавыя звесткі пра першае пасольства Ягайлы і Вітаўта да турэцкага султана Мехмета ў 1415 г. [1, с. 153], спробы заключыць вечны мір з Тэўтонскім ордэнам у 1415 г., 1418 г. [1, с. 154], заключэнне антыкрыжацкага пагаднення з Эрыкам Памеранскім, каралём Даніі, Швецыі і Нарвегіі ў 1418 г. [1, с. 155 – 156], актыўны ўплыў Вітаўта на выбранне татарскіх ханаў у 1418 і 1419 гг. [1, с. 156 – 158], ролю ВКЛ у падзеях у Чэхіі [1, с. 158 – 159] і накіраванне туды ў 1422 г. князя Жыгімонта Карыбутавіча і яго дзейнасць [1, с. 160 - 162], заключэнне Мельнінскага пагаднення з крыжакамі ў 1422 г. [1, с. 162 – 164], прывядзенне ў падпарадкаванне Пскова ў 1426 г. [1, с. 165] і Ноўгарада ў 1428 г. [1, с. 167], спробах Вітаўта ператварыць ВКЛ у каралеўства і ролі ў гэтым імператара Жыгімонта Люксембурскага [1, с. 168 – 176].

У кнізе 16 змешчана інфармацыя пра падзеі барацьбы з Польшчай за Валынь і Падолле ў 1430-х гг. [1, с. 178, 180 – 184].

У кнізе 17 знаходзіліся звесткі пра пацвярджэнне ўніі з Польшчай вялікім князем Жыгімонтам Кейстутавічам у 1434 г. [1, с. 193], умяшанне Інфлянцкага Ордэна ў падзеі феадальнай вайны ў ВКЛ [1, с. 193 – 196], сутыкненні з Масквой у 1442 [1, с. 210 – 211].

У кнізе 18 змешчаны звесткі аб абранні вялікага князя Казіміра польскім каралём у 1445 г. [1, с. 224], аднаўленні спрэчак з Польшчай за Падолле [1, с. 229, 231 – 234], пра частыя набегі на татар на землі ВКЛ [1, с. 229, 231 – 235], шлюб Казіміра з Альжбетай Габсбург у 1454 г. [1, с. 238], аб пачатку Трынаццацігадовай вайны Польшчы з Тэўтонскім Ордэнам у 1454 г. [1, с. 238 – 240].

Такім чынам, "Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсёй Русі" Мацея Стрыйкоўскага ўтрымлівае шмат гістарычнай інфармацыі аб падзеях знешняй палітыкі ВКЛ разглядаемага перыяду, дае іх часам суб'ектыўную трактоўку і з'яўляецца каштоўнай крыніцай звестак пра мінулае беларускіх зямель.


1. Stryjkowski, M. Kronika Polska, Litewska, Zmodzka i Wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego. Wydanie nowe, będące dokładnem powtorzeniem wydania pierwotnego krolewieckiego z roku 1582, poprzedzone Wiadomością o życiu i pismach Stryjkowskiego przez Mikołaja Malinowskiego, oraz Rozprawą o latopiscach Ruskich przez Daniłowicza, pomnożone przedrukiem dzieł pomniejszych Stryjkowskiego według pierwotnych wydań/ M. Stryjkowski. – Warszawa: Nakład Gustawa Leona Glucksberga, Księgarza, 1846. – T. II. – 572 s.
2. Stryjkowski, M. Ktora przedtym nigdy światła nie widziała Kronika Polska, Litewska, Zmodzka, y wszystkiey Rusi Kijowskiey, Moskiewskiey, Siewierskiey, Wołynskiey, Podolskiey, etc. / M. Stryjkowski. – Drukowano w Krolewcu v Gerzego Ostenbergera: M.D.LXXXII. – Fol., k. tyt. i k. 20 nlb.; str.1+791.
3. Stryjkowski, M. Kronika Macieja Stryjkowskiego niegdyś w Królewcu drukowana/ M. Stryjkowski. – Warszawa: Drukarnia Societatis Jesu, 1766. – IX, 360 s.
4. Семянчук, А.А. Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі: вычэбны дапаможнік/ А.А. Семянчук. – Гродна: ГрДУ, 2000. – 163 с.
5. Белазаровіч, В.А. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі : дапаможнік / В.А. Белазаровіч; пад агульн. рэд. І.П. Крэня, А.М. Нечухрына. – Гродна: ГрДУ, 2006. – 346 с.
6. Wojtkowiak, Z. Maciej Stryjkowski – dziejopis Wielkiego Księstwa Litewskiego. Kalendarium życia i działalności/ Z. Wojtkowiak. – Poznań: Adam Mickiewicz University Press, 1990. – 248 s.
7. Семянчук, А. Стрыйкоўскі Мацей/ А. Семянчук// Вялікае княства Літоўскае. У 2 т./ Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. З.Э. Герасімовіч. – Мінск: БелЭН, 2005 – 2006. – Т. 2. Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – 792 с.: іл.
8. Чамярыцкі, В. "Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсёй Русі"/ В. Чамярыцкі// Вялікае княства Літоўскае. У 2 т./ Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. З.Э. Герасімовіч. – Мінск: БелЭН, 2005 – 2006. – Т. 2. Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – 792 с.: іл.